# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**№ 4 (18) 1998**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

*Галоўны рэдактар:*
Л. Н. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
А. А. Грымаць
Т. А. Грыгор'ева
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
Т. Е. Лемешава
(*адказны сакратар*)
М. І. Мішчанчук
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
І. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

## ЗМЕСТ

**Педагогіка**

*Вадзінскі Д. І.* Педагагічная тэхніка і тэхналогія навучання ........ 3

*Іваноў Ю. А.* Вынікі эксперыментальнай работы па выхаванню мышлення ў вучняў ........ 7

*Міцкевіч М. І.* Дыдактычныя асновы непарыўнай адукацыі (метадалогія) ........ 12

*Старжынская Н. С.* Фарміраванне ў старэйшых дашкольнікаў уяўленняў аб уласных імёнах ........ 15

*Буднікаў Я. Р.* Функцыя як паняцце школьнай матэматыкі ........ 20

*Ефімчык А. А.* Метады ўвядзення паняццяў у працэсе навучання матэматыцы ........ 24

*Забаўская І. І., Саўчанка Н. В.* Да праблемы выкладання курса «Асновы педагагічнага майстэрства» . 27

*Сілівон В. А.* Пачуццё гармоніі — агульная здольнасць да выяўленчай дзейнасці ........ 30

**Дэфекталогія**

*Гладкая В. У.* Дыягностыка падрыхтаванасці да бытавой працы вучняў малодшых класаў школ-інтэрнатаў ........ 36

**Псіхалогія**

*Бакуновіч М. Ф.* Асаблівасці мэт вучэбнай дзейнасці студэнтаў І курса ........ 41

*Анапрэенка Я. Р.* Карэляцыя акцэнтуацый характару і татуіровак у падлеткаў, схільных да супрацьпраўных паводзін ........ 45

**Мовазнаўства**

*Саўко У. П.* Праблема засваення нормаў беларускай літаратурнай мовы пры вывучэнні марфалогіі ........ 52

*Бендетович Г. Б.* Когнитивизм и прагматика в современной лингвистике ........ 57

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

АКЛ

## SUMMARY

*The three principal methods of introduction of meaning in mathematics instead of two traditional ones and a short description of them are presented in the article.*


УДК 378.147

*І. І. Забаўская, Н. В. Саўчанка*

# ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «АСНОВЫ ПЕДАГАГІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА»

Педагагічнае майстэрства будучых спецыялістаў пачатковай школы ўяўляе сабой складаную з'яву, якая фарміруецца з сукупнасці асобасных рыс выкладчыка, педагагічнай тэхнікі, тэхналогіі, эрудыцыі і гатоўнасці яго да прафесійнага ўдасканалення. На наш погляд, выключную ролю ў фарміраванні вызначаных якасцей адыгрывае курс «Асновы педагагічнага майстэрства», які разлічаны, згодна з вучэбнай праграмай факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання, на 50 гадзін (20 лекцыйных і 30 лабараторных).

У курсе прадугледжваецца выкананне наступных відаў работ.

1. Складанне і ажыццяўленне праграмы прафесійнага самавыканання і самаадукацыі.
2. Самастойная работа з перыёдыкай.
3. Напісанне сачыненняў і рэфератаў на педагагічную тэматыку.
4. Аналіз тэкстаў мастацкіх твораў.
5. Валоданне мовай, аратарскім майстэрствам, псіхафізічным станам і знешнімі рэакцыямі.
6. Складанне сачыненняў асабістых дыдактычных казак і іх інсцэніраванне з тэатральнымі лялькамі.
7. Педагагічныя публічныя выступленні на занятках. З мэтай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да іх прафесійнай дзейнасці прадугледжваюцца зносіны з дзіцячай, бацькоўскай і педагагічнай аўдыторыяй.
8. Правядзенне конкурсу педагагічнага майстэрства.

**Адзін з варыянтаў правядзення конкурсу**

Конкурс уключае 4 этапы.

*Перш этап.* Індывідуальнае выкананне мастацкіх і літаратурных твораў.

Крытэрыі ацэнкі задання

1. Уменне вылучаць лагічную, эмацыянальна-вобразную выразнасць літаратурнага твора, які выконваецца.
2. Уменне ўлічваць узроставыя асаблівасці вучняў.
3. Дакладнае ўзнаўленне вобразаў, іх адпаведнасць апісанню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Уменне славесным дзеяннем творча перадаць у падтэксце ідэю аўтара твора ў момант выканання.

5. Навыкі валодання аўдыторыяй, мэтазгоднасць мімікі і пантамімікі, натуральнасць паводзін.

*Другі этап.* Першае заданне: сцэнічнае ажыццяўленне ўласнааўтарскай дыдактычнай казкі ў фрагменце ўрока.

Выкананне можа быць індывідуальным і групавым, калі рэалізацыя казкі адбываецца з дапамогай тэатральных лялек з мэтай не толькі выхавання, але і навучання. Умелае выкарыстанне лялек у гэтым працэсе прадугледжвае ўжыванне комплексу мастацкіх сродкаў эфектыўнага ўздзеяння на малодшых школьнікаў для павышэння іх пазнавальнай актыўнасці.

Крытэрыі ацэнкі задання

1. Адпаведнасць задачам вучэбных праграм.
2. Трапная падача мастацкага слова.
3. Улік індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей навучэнцаў, зрокавы і вербальны кантакты.
4. Літаратурны і педагагічны змест вылучанай казкі.
5. Яркасць і арыгінальнасць вобразаў.
6. Лагічнасць выкладання, паслядоўнасць у раскрыцці галоўнай ідэі.
7. Умелае выкарыстанне музыкі, сродкаў нагляднасці і дэкарацый.
8. Неабходнасць высновы «Дабро перамагае зло».

Другое заданне: прадстаўленне і абарона нагляднага дапаможніка.

Пры выкананні задання прадугледжваецца яго падрыхтоўка, тлумачэнне значнасці выкарыстання нагляднасці ў ходзе навучальна-выхаваўчага працэсу.

*Трэці этап.* Першае заданне: інсцэніроўка акадэмічнай групай літаратурнага твора на працягу 1—15 хвілін.

Крытэрыі ацэнкі задання

1. Арыгінальнасць абранага твора.
2. Уменне сцэнічнымі сродкамі падкрэсліць асаблівасці характару персанажа, яго ўнутраны стан і выключнасць.
3. Набыццё навыкаў супольнай работы на сцэне, творчы падыход да рэжысёрскага ўвасаблення сцэнарыя.
4. Улік спецыфікі розных літаратурных жанраў.
5. Умелая афарбоўка п'есы (музычнае афармленне, дэкарацыі, касцюміраванне, пастаноўка асвятлення і інш.).
6. Валоданне культурай мовы (граматычная дакладнасць, інтанацыйная выразнасць і аптымальны тэмп, дынаміка славеснага дзеяння).

Другое заданне: сцэнічнае ўвасабленне народнага свята-агляду як вышэйшай формы дэманстрацыі індывідуальнай і калектыўнай творчасці аб'ядноўвае той ці іншы асобны каляндарна-абрадавы цыкл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Крытэрыі ацэнкі задання

1. Выхаванне нацыянальнай самасвядомасці ў члена акадэмічнай групы ў працэсе навучання і выхавання шляхам азнаямлення з нацыянальнымі абрадавымі традыцыямі.

2. Творчы падыход да складання зместу сцэнарыя свята і яго правядзення.

3. Тэхнічная, лагічная, эмацыянальна-вобразная выразнасць выканання.

*Чацвёрты этап.* Каманднае прайграванне і тлумачэнне педагагічных сітуацый, прапанаваных журы, або іншай групай.

Апошняе заданне патрабуе ад студэнтаў умення прагназіраваць, фармуляваць і вырашаць педагагічныя задачы (сітуатыўныя, тактычныя або прамежкавыя і стратэгічныя або ўмоўна конечныя), валодаць педагагічнай тэхнікай і педтактам; вызначае ўзровень псіхолага-педагагічнай падрыхтаванасці, творчага мыслення, інтуіцыі, знаходлівасці ў вырашэнні педагагічных задач.

Крытэрыі ацэнкі задання

1. Уменне пераводзіць вучняў ў зададзены стан (не пазнаў-пазнай і г. д.).

2. Усведамленне таго, што педагагічная задача існуе да той пары, пакуль не вырашыцца.

3. Гатоўнасць прадбачыць магчымую рэакцыю навучэнцаў на сваё ўздзеянне, уменне прадухіляць канфлікты і выбіраць аптымальныя шляхі педагагічнага уздзеяння на вучняў у кожнай канкрэтнай сітуацыі.

Падвядзенне вынікаў

Вылучаныя віды работ і прапанаваная праграма конкурсу носяць, безумоўна, рэкамендацыйны характар. Разуменне выкладчыкам тых ці іншых пытанняў курса, наяўнасць неабходнай літаратуры, свайго менталітэту, прафесійна-педагагічная падрыхтаванасць дапамагаюць яму ўстанавіць ступень значнасці існуючых крыніц па абранай праблеме. Галоўным прынцыпам у ёй застаецца творчае фарміраванне ў будучых педагогаў навыкаў уздзеяння на асобу і калектыў.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. *Каляда А. А.* Выразнае чытанне. Мн., 1989.
2. *Головин Б. Н.* Основы культуры речи. М., 1988.
3. *Кухарев Н. В., Решетько В. С.* Диагностика педагогического мастерства и педагогического творчества: В 3 ч. Мн., 1996.
4. Основы педагогического мастерства / Под ред. И. А. Зязюна. М., 1989.
5. *Петрова А. П.* Сценическая речь. М., 1981.
6. *Сиверцева Л. А.* Школьный театр кукол. Мн., 1988.
7. *Осипова М. П.* Методика воспитательной работы: Прак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тикум. Мн., 1991.
8. *Лаврухин В. И.* Учебно-творческие занятия по сценическому движению в детской театральной самодеятельности: Метод. рек. Мн., 1988.
9. *Иванченко С. С.* Самостоятельная работа по выразительному чтению (планирование и контроль). Кривой Рог, 1988.
10. *Канаш В. П.* Выхаваўчая работа ў школе на аснове кадяндарнай абраднасці беларусаў. Мн., 1995.
11. *Сучкоў І. І.* Беларускі фальклор у школе. І клас: Дапаможнік для настаўніка. Мн., 1996.
12. *Дуброва В. П., Мілашэвіч А. П., Саўчанка Л. Ф.* Адраджэнне нацыянальных традыцый у дзіцячым садзе: (з вопыту работы). Віцебск, 1994.
13. *Панцялей Р. М., Крыванос К. А., Маглыш М. А.* Як адзначыць з дзецьмі народныя святы: Метад. рэк. Ч. 1. Мн., 1993.
14. *Касцюкавец Л. П.* Беларускія народныя абрады. Мн., 1993.
15. *Недумова М. А.* Кукольный театр в школе // Нач. школа. 1997. № 3.

*SUMMARY*

*The article determines some of work on the course of Principles of Teaching Skills. The author proposes one of the variants of the programme for holding a competition on teaching skills.*

УДК 741:152.27

*В. А. Сілівон*

## НАЧУЦЦЁ ГАРМОНІІ — АГУЛЬНАЯ ЗДОЛЬНАСЦЬ ДА ВЫЯЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Псіхолагі дэфінуюць здольнасці як асобныя псіхічныя якасці ці асаблівасці чалавека, што ўплываюць на эфектыўнасць выканання якой-небудзь дзейнасці (Б. Г. Ананьеў, Б. П. Цяплоў). Асновай для гэтых здольнасцей, лічаць большасць вучоных, з'яўляюцца «у спадчыну замацаваныя перадумовы ў выглядзе задаткаў» (С. А. Рубінштэйн, А. Г. Кавалёў, Б. П. Цяплоў і іншыя).

Здольнасць да выяўленчай дзейнасці праяўляецца перш за ўсё ў «асобым бачанні», «асобай зрокавай чуллівасці», «асобай умеласці рукі» ці ва ўзгодненых рухах рукі», а таксама ў яркім уяўленні і асобым эмацыянальным настрої (Э. Мейман, Н. П. Сакуліна, Е. Ф. Рыбалка, А. Г. Кавалёў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ